ДУ "Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна"

Аддзел бібліятэказнаўства




# «Дзіўны свет казкі» :

## метадычныя парады да 105-годдзя з дня нараджэння Васіля Віткі.

**Мінск 2016**

# Васіль Вітка
# (1911–1996)

## Біяграфія

Васіль Вітка (Цімох Васільевіч Крысько) нарадзіўся 16 мая 1911 г. у в. Еўлічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям’і.

В. Вітка – класік беларускай дзіцячай літаратуры, заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1970). У 1972 г. за кнігі для дзяцей “Беларуская калыханка”, “Казкі”, “Чытанка-маляванка” пісьменнік быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР. У 1978 г. атрымаў Міжнародны ганаровы дыплом імя Х.-К.Андэрсена, і яго прозвішча было занесена ў спіс лепшых казачнікаў свету.

Пачынаючы з 1944 г. Цімох Васільевіч працаваў у часопісе “Беларусь”, у 1948 г. стаў намеснікам рэдактара, а потым – галоўным рэдактарам газеты “Літаратура і мастацва”.

Сапраўдную вядомасць ён набыў у дзіцячай літаратуры як паэт-казачнік. Амаль дваццаць гадоў Васіль Вітка аддаў выхаванню маленькіх грамадзян як рэдактар часопіса “Вясёлка”. Першую

вершаваную казку “Вавёрчына гара” паэт надрукаваў у 1948 г. Васіль Вітка вядомы і як перакладчык. Ён перакладаў прозу і паэзію, “дарослую” і дзіцячую.

Васіль Вітка вядомы і як перакладчык, які пазнаёміў  нашага юнага чытача з лепшымі творамі замежных аўтараў на беларускай мове.

Яму належаць пераклады з рускай мовы М.Салтыкова-Шчадрына, А.Талстога, А.Чэхава, У.Маякоўскага, С.Маршака, С.Міхалкова, А.Барто, М.Рубцова, з украінскай М.Рыльскага, В.Бычко, М.Стэльмаха, П.Варанько, літоўскай М.Вайнілайціса, латышскай Я.Райніса, В.Лукса, Я.Османіса, балгарскай А.Босева, Л. Станчава, англійскай У.Мэя.

Памёр Цімох Васільевіч 5 ліпеня 1996 г.

## «Дзіўны свет казкі»

Сцэнарый літаратурнай вечарыны для дзяцей
да 105-годдзя з дня нараджэння Васіля Віткі

*(У зале арганізавана кніжная выстава
твораў паэта з яго партрэтам)*

*Чытальнік І*
*Чытальнік ІІ*
*Вядучая*

***Вядучая:***

Прывітанне, дарагія сябры! Мы вельмі рады бачыць вас сёння! Скажыце, а вы любіце загадкі? *(Адказваюць дзеці)* Вось і цудоўна! Давайце праверым!

***Чытальнік І:***

…птушка,
Што малых не любіць гушкаць,
Ні спяваць ім калыханкі,
Ні вадзіць на пагулянкі,
Ні расказваць байкі-казкі,
Бо яе малыя дзеці
Раскіданы па ўсім свеце.
Іх чужыя кормяць маткі,
Даглядаюць і гадуюць. *(Зязюля)*

***Чытальнік II:***

Цвінь-цвень! Пінь-пень!
Добры дзень! Добры дзень!
Хто гэта мяне вітае –
Ці шчыгол, ці салоўка гэта?... *(Сініца)*

***Чытальнік I:***

Да гнязда майго высока.
Праўда, што люблю я красці,
Але ж рэчы дарагія –
Срэбраныя, залатыя,
Лыжкі, гузікі, пярсцёнкі,
Што здалёку ўсім відны,
Густ на іх у мяне тонкі. *(Сарока)*

***Чытальнік II:***

Дасціпны, увішны,
Слаўны ён спявак –
Светлая манішка,
Паверх – доўгі фрак.
Пэўна, што заслужаны,
Хоць на выгляд шэры ён,
А голас не застужаны, –
І сам без фанабэры. *(Салавей)*

***Вядучая:***

Якія малайцы! Усё ведаеце! Зараз мы з вамі бліжэй пазнаёмімся з творчасцю выдатнага дзіцячага пісьменніка Васіля Віткі – паэта, празаіка,

перакладчыка і публіцыста. Паслухаем жартаўлівую казку, толькі будзце уважлівымі, падумайце, якую назву вы прыдумалі б да гэтай казкі! Пачынаем!

***Чытальнік І:***

Гэй, дарогу, гэй, шырэй,
Лес густы, высокі –
На машыне верабей
Едзе да сарокі.

У пагонах, у шнурах,
У шпорах са звонам,
Белабока толькі: – Ах! –
Сказала з паклонам.

– Калі ласка, ваша чэсць.
Я даўно чакала.
Запрашаю за стол сесць
Госця-генерала.

Налучыўся тут мядзведзь
На такое дзіва.
– Цьфу, няма на што глядзець! –
І ўсміхнуўся крыва.

Усхапіўся верабей,
Адважны задзіра,
Як падыме крык: – Не смей
Зневажаць мундзіра!

Загрудкі мядзведзя – цап:
– Ведай, з кім заняўся!
Ледзьве з вераб'ёвых лап
Мішка ўратаваўся. *(“Генерал верабей”)*

***Вядучая:***

Дзецi, скажыце, вам спадабалася казка?! (*Дзецi адказваюць)*. А як бы вы яе назвалi? (*Дзецi адказваюць)* Малайцы! Давайце паслухаем яшчэ адну!

***Чытальнiк II:***

Жыў на свеце дзед Васiль,
За плячыма мех насiў.

Дазналiся мышкi,
Што ў мяшэчку кнiжкi,

Разгрызлi завязкi,
Бачаць, ажно ж – казкi.
Сталi клiкаць дзяцей:
– Гэй, сюды ўсе хутчэй!

Ёсць тут маляванкi,
Складанкi-чытанкi,

Байкi-самаграйкi,
Песнi-калыханкi,

Жарты-перакруткi,
Гулi-самагудкi,

Лiчылкi-загадкi,
Ладачкi-ладкi...

Падыходзьце, малышы,
Кожнаму пацешка ёсць!
Дзед Васiль, а ты пiшы
I яшчэ нам прынось! *(“Казкi Дзеда Васiля”)*

***Вядучая:***

А гэту як назавеце? (*Дзеці адказваюць)*. Якія ж вы разумнікі! А зараз паслухаем апошнюю казку, а вы паспрабуйце намаляваць тое, што пачуеце! Добра? Пачынаем!

***Чытальнік I:***

Сеў у полі на каменьчыку,
Узяў дудку на раменьчыку.

Ду-ду-ду – дуда гудзе,
Полем водгалас ідзе.

Надакучыла іграць,
Каля дуба лёг паспаць.

Вісіць дудка на суку,
Спіць дударык на баку.

Павярнуўся дагары
І так моцна ён захроп –

Скалануўся дуб стары,
Дудка – бух у самы лоб.

Тут яму і сон не ў сон,
На ілбе гудзе ўжо гуз.

Не сабраў і трэсак ён,
Бо ад дудкі – толькі друз.
Падняў хлопец паясок,
Пайшоў з плачам у лясок:

– Куды дзецца мне цяпер?
Цікаваць буду цяцер.

Спадцішка пад куст падпоўз
І цяцёрку – хоп за хвост.

З пёрка выразаў дуду:
– Ой, зайграю, загуду.

Што было, тое сплыло,
Пайду з дудкаю ў сяло.

Я пад першы парог,
А мне з хаты – пірог.

Я на дудцы: ту-гу-гу –
Ўсе нясуць па пірагу:

Мне і матка – пірог,
Мне і татка – пірог,

Мне і дзядзька – пірог,
Мне і цётка – пірог,

Мне – дзедка – пірог,
І суседка – пірог,

І браценік – пірог,
І пляменнік – пірог.

Назбіраў я пірагоў
Сорак восем карабоў.
Каб яшчэ адзін пірог,
Я зусім бы абнямог.

Перастань, дуда, дудзець!
Дзе мне пірагі падзець?

Сабралася ўся радня,
Памагчы ўсе рады мне.

Запрагаюць каня –
Ён і воза не скране.

Падагналі грузавік,
Для яго груз вялік.

Папрасілі самазвала,
Ў самазвала сілы мала.

Залучыў я камара,
Магутнага званара.

Той адразу ўзяў мой воз,
Пірагі мае павёз.

Ай камар-маладзец!
Тут і казцы канец. *("Дударык")*

***Вядучая:***

Ну, пакажыце, што у вас атрымалася! Да вы проста сапраўдныя мастакі!

***Чытальнік II:***

Гэта казка пра цара
Белавежскага зубра.
Калі хто яго баіцца,
Няхай з намі не садзіцца.

Самых смелых сярод вас
Просім слухаць гэты сказ.

***Вядучая:***

Гэта “Казка пра цара зубра”. Галоўны герой Вася, які адважыўся кінуць выклік цару звяроў – белавежскаму зубру. Вася перамог грознага цара пушчы. Прымусіў яго падпісаць пакт міру і дружбы… Хочаце ведаць, што было далей? Абавязкова вазьміце пасля нашай сустрэчы гэту кніжку!

***Вядучая:***

Наскрозь прасякнута гульнёй і кніга “Чытанка-маляванка” – адзіная пакуль у гісторыі беларускага кнігадруку. Гэта кніга – цэлы мех гульняў-забаўлянак. Пры дапамозе гульняў-вершаў можна выхоўваць эмацыянальную моўную культуру, разумовыя здольнасці, выхоўваць лічылкай:

***Чытальнік ІІ:***

Маладыя аленікі
Елі варэнікі,
Журавель – журавіны,
А жырафа – апельсіны,
Бегемот – ананасы,
А янот – бульбу з квасам,
Жук жур жор,
Тхор сыр цёр…

*(“Маладыя аленікі”)*

***Вядучая:***

Скарагаворкай:

***Чытальнік I:***

Рак поўз паўз барак,
Сустракае рака грак:
– Здароў, рак, дай руку,
У раку завалаку.
*(“Рак”)*

***Вядучая:***

Загадкай:

***Чытальнік II:***

Круглы, як сонца,
Шыпіць пад ім донца.
Падрумяніцца бачок –
Скоціцца на рушнічок.
*(“Блінец”)*

***Вядучая:***

Дарагія дзеткі, бачыце, якія цудоўныя вершы выдатнага дзіцячага пісьменніка Васіля Віткі прачыталі мы з вамі разам, якая прыгожая і мілагучная наша родная мова. Наша сённяшняя сустрэча падышла да канца, надышоў час развітвацца. Але мы спадзяёмся,што вы сёння даведаліся шмат чаго новага і цікавага пра выдатнага беларускага дзіцячага пісьменніка Васіля Вітку і што пасля нашай сустрэчы вы возьмеце пачытаць яго цудоўныя казкі і вершы ў нашай бібліятэцы! Да новых сустрэч!

## Мастацкія творы:

Беларуская калыханка : паэма: для старэйш. шк. ўзросту / Васіль Вітка; маст. Г.Паплаўскі. – Мн. : Беларусь, 1971. – 40 с.

Вышыні святла : вершы / Васіль Вітка. – Мн. : Маст. літ., 1977. – 110 с.

Дзеці і мы : дзённікі, нарысы, апавяданні / Васіль Вітка. – Мн. : Маст. літ., 1977. – 270 с.

Для дома, для альбома і трохі для эпохі : гумар, сатыра / Васіль Вітка. – Мн. : Маст. літ., 1983. – 175 с.

Дом, дзе жывуць словы : слоўнік народнай мовы для дзяцей / Васіль Вітка. – Мінск : Маст. літ., 1995.– 128 с.

Загадка пра зярнятка : верш / Васіль Вітка; маст. У.Савіч. – Мн. : Юнацтва, 1984.–16 с.

Мінскія балады : вершы : для сярэд. шк. узросту / Васіль Вітка; маст. Л.І.Зяневіч. – Мн.: Юнацтва, 1982.– 54 с.

Перад парогам : вершы, казкі / Васіль Вітка. – Мн. : Маст. літ., 2001.– 241,[5] с.

Праводзіны лета : вершы / Васіль Вітка; іл. З.Бароўкі. – Мн. : Беларусь, 1972. – 158 с.

Роднае слова : кн. для чытання у 2-м кл. / Васіль Вітка. – Мінск : Нар. асвета, 1989. – 223 с.

Случчына : вершы, паэмы, казкі / Васіль Вітка; маст. У.С.Басалыга. – Мн. : Маст. літ., 1981.

Трэція пеўні : вершы, паэмы, пераклады / Васіль Вітка. – Мн. : Маст. літ., 1988. – 159 с.

Урокі роднага слова : вершы, казкі, апавяданні / Васіль Вітка. – Мінск : Юнацтва, 2001. – 263, [1] с.

Чытанка-маляванка : ладачкі-ладкі, лічылкі, загадкі, байкі, самагудкі, жарты, перакруткі, казкі, пацешкі, вясёлыя ўсмешкі : [для дзяцей дашк. і мл. шк. узросту] / Васіль Вітка. – Мінск : Юнацтва, 1998.– 175 с.

Шчасце паэта : драмат. паэма : у 4 акт.,10 карц. / Васіль Вітка. – Мн. : Дзяржвыд БССР, 1951. – 115 с.

## Аб жыцці і творчасці пісьменніка

Барысенка, В. Вобразнае азначэнне ў паэзіі Васіля Віткі // Роднае слова. – 2001. – № 5. – С. 28–31.

Бензярук, Р.М. Сем урокаў мудраца / Расціслаў Бензярук // Маладосць. – 2011. – № 6.– С. 117–121.

“Будзеш ты ўсюды неразлучаны…” : [аб жыццёвым шляху В. Віткі]. – У кн.: Васелевіч А. Элегія : апавяданні, эцюды, эсэ. – Мн.: Маст літ., 1988. – С. 199–212.

Витка, В. Терпи, мужайся, верь / Василь Витка; публикация и предисловие Юлии Чернявской // Нёман. – 2010. – № 4. – С. 148–172.

Вольскі, А. Казачнік, паэт, педагог: [75 год з дня нараджэння В.Віткі] // Нар. асвета. – 1986. – № 5. – С. 76–78.

Грахоўскі, С. З разведчыкаў шчасця: [пра Васіля Вітку ] // Грахоўскі С. Так і было. – Мн., 1986. – С. 129–132.

Казека, Я. Гартаванне слова: [пра паэзію В. Віткі] / Я.Казека. – Мн.: Маст. літ., 1985. – С. 75–94.

Лобан, М. Валадар чароўнага ключыка: [да 60-годдзя з дня нараджэння В. Віткі] // ЛіМ. – 1971. –14 мая.

Лобан, М. Слова пра друга: [думкі пра паэзію В. Віткі]. – У кн.: Лобан М. Пяць раніц тыдня. – Мн.: Маст. літ., 1984. – С. 217–221.

Ляшук, В. Чарадзейства слоў // Полымя. – 1998. – № 1. – С. 263–277.

Стральцоў, М. Настаўнік з вялікай літары. – У кн.: Стральцоў, М. У полі зроку. Літаратурна-крытычныя артыкулы і эсэ. – Мн.: Маст. літ., 1926. – С. 110–112.

Яфімава, М.Б. Васіль Вітка (1911–1996) / М. Б. Яфімава // Літаратурныя партрэты. – Мн., 2003. – С. 18–20.

# **Дзіўны свет казкі**
(метадычныя парады да 105-годдзя
з дня нараджэння Васіля Віткі)


| | |
|---|---|
| Складальнікі: | Мельнічак А.А. |
| Рэдактар: | Законнікава Л.Р. |
| Адказны за выпуск: | Лыка М.У. |
| Падпісана да друку | 10.03.2015 |
| Тыраж 3 экз. | Заказ № 2 |

Рызограф Мінскай абласной бібліятэкі
імя А.С.Пушкіна

220005 г. Мінск, вул. Гікалы, 4
Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна